# САМАЯ ПРЫГОЖАЯ

## Мінчанка стала «Міс Беларусь-2016»

**Фінальнае шоу X Нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь-2016», арганізатарам якога па традыцыі выступіў тэлеканал АНТ, прайшло ў нядзелю ў сталічным Палацы спорту. 26 прэтэндэнтак на званне самай прыгожай беларускі мелі магчымасць паказаць сваю прыгажосць і ўменне трымаць сябе, прадэманстраваўшы іх падчас некалькіх дэфіле. Карона і тытул дасталіся мінчанцы Паліне Барадачовай.**

Прысутнічаў на шоу і Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Ён не ўтойваў, што прыйшоў на мерапрыемства, каб аддаць даніну павагі нашым прыгожым жанчынам, бо яны — жамчужыны ў каралях беларускага народу. «Не мог я абысці ўвагай юбілейны конкурс і па прычыне таго, што ён праходзіць у Год культуры, — дадаў Прэзідэнт. — А пакланенне прыгожаму складае аснову любой культуры. Жаночая прыгажосць з'яўляецца адным з самых надзвычайных тварэнняў маці прыроды... І конкурс дае дзяўчатам магчымасць праявіць сябе, раскрыць новыя грані сваіх талентаў. Сёлетнія фіналісткі конкурсу «Міс Беларусь» увасабляюць у сабе найлепшыя рысы маладога пакалення беларусаў, дзе гарманічна яднаюцца знешняя прывабнасць з унутранай душэўнай прыгажосцю».

Паводле ўмоў конкурсу, новая пераможца прадставіць сёлета нашу краіну на міжнародным конкурсе прыгажосці «Міс свету-2016», а таксама будзе ўдзельнічаць у розных культурных, сацыяльных і дабрачынных мерапрыемствах у Беларусі і за мяжой. У размове з журналістамі дзяўчына прызналася, што на конкурс трапіла з другой спробы (два гады таму кастынг не даў магчымасці трапіць у лік фіналістак). А трапіць на конкурс і перамагчы Паліна марыла, як і многія, з дзяцінства. Напярэдадні конкурсу ёй прысніўся сон, дзе ўбачыла свой зорны час, і мара спраўдзілася... Тытулы «Першая віцэ-міс» і «Другая віцэ-міс» журы прысудзіла Кацярыне Саўчук з Мінска і Настассі Сарока з Маладзечна. «Прыз глядацкіх сімпатый» па выніках галасавання на сайце тэлеканала АНТ дастаўся Вераніцы Кот з Ліды. Уладальніцамі тытулаў «Міс дружба» (яе канкурсанткі самі выбіралі ў ходзе тайнага галасавання) стала Настасся Ісакава з Полацка, «Міс топ-мадэль» — мінчанка Паліна Пімахіна, «Міс фота» — Марыя Лабанава з Гомеля, «Міс «Арыфлэйм» — Хрысціна Мяцеша з Бяльініч. Яшчэ прыемнай навіной для ўсіх удзельніц конкурсу стала тое, што кожная з іх зможа пазмагацца за шанц стаць вядучай тэлеканала АНТ.

На працягу вечара фіналісткі радавалі прысутных у зале і тэлегледачоў (якія маглі назіраць за шоу тэлеканала АНТ у вячэрнім эфіры) выхадамі ў касцюмах розных эпох: Полацкага Княства, перыяду росквіту ВКЛ, эпохі Барбары Радзівіл, ампіру, а таксама ў стылізаваных беларускіх строях. Усе яны былі створаны камандай беларускіх дызайнераў. Як прызналіся самі дзяўчаты, прымераць на сябе жаночыя вобразы мінулых стагоддзяў — цікавы вопыт, які даў магчымасць у думках здзейсніць падарожжа ў былое.

— У мяне быў касцюм часоў стылю ампір. Я даўно марыла прымераць на сябе вобраз жанчыны з мінулых часоў. Аднак, шчыра кажучы, цяжка было падаць сябе прыгожа ў такіх строях. Даводзілася ўяўляць сябе какеткай, ужывацца ў ролю ўяўнага персанажа. І гэта дазволіла нам праявіць сваё акцёрскае майстэрства, — адзначыла канкурсантка Вольга Паўлава.

Увогуле дзяўчаты выходзілі ў чатырох дэфіле: у касцюмах калекцыі з лёну, стылізаваных старажытных строях, купальніках з мехавымі аксесуарамі і ў вячэрніх сукенках. Праўда, акрамя дэманстрацыі сваіх мадэльных параметраў, акцёрскага майстэрства і ўмення выказваць эмоцыі выразам вачэй і з дапамогай усмешкі, у гэты вечар больш нічога пра кожную з прэтэндэнтак мы не даведаліся... А як жа дэманстрацыя ўнутранай прыгажосці?



Фота БЕЛТА.

Варта адзначыць, што заява арганізатараў пра тое, што лейтматыў сёлетняга конкурсу — нацыянальны каларыт, дзе тэмы беларускай мовы, культуры, гісторыі будуць ключавымі, таксама часткова стала разынкай на свяце прыгажосці. Гасцямі свята, якія падтрымлівалі канкурсантак і радавалі гледачоў, сталі вядомыя беларускія артысты і калектывы: Дзмітрый Калдун, Аляксей Грос, гурт NAVI, прадстаўнік Беларусі на «Еўрабачанні-2016» IVAN, спявачка Алена Ланская, харэаграфічны ансамбль «Харошкі» і многія іншыя.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

■ Стыхія

# Залье, задзьме і прыпячэ

## На працягу тыдня дзённая тэмпература паветра будзе даходзіць да плюс 30—34 градусаў

**На тэрыторыі краіны захаваецца вельмі цёплае, месцамі гарачае надвор'е, якое будзе суправаджацца навальнічнымі даждджамі і моцным ветрам, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У першай палове тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будуць вызначаць актыўныя атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. Таму сёння на большай частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Спецыялісты Белгідраметэацэнтра папярэджваюць, што чакаюцца навальніцы, а месцамі і моцныя лівні. Больш за тое, у другой палове дня па паўднёвым усходзе краіны месцамі прагназуецца град. Пры навальніцах месцамі будзе шквалістае ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 23—29 градусаў, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — да 34 цяпла.

Атмасферныя франты будуць гаспадарыць у нас і ў сераду, аднак яны пачнуць рухацца далей у паўднёва-ўсходнім напрамку. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны і ўдзень пераважна па паўднёвым усходзе чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 13 да 19 цяпла, а ўдзень увогуле паўсюдна чакаецца плюс 30—34 градусы. Надалей надвор'ем будзе кіраваць зона высокага атмасфернага ціску, якая сфарміравана ў няўстойлівай паветранай масе. Дажджы будуць праходзіць месцамі. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе ад плюс 13—20 градусаў, удзень — плюс 23—29 градусаў, а па поўдні краіны паветра прагрэецца да 32 цяпла.

Мяркуецца, што ў пятніцу і суботу паветраныя масы пачнуць паступаць да нас з боку Міжземнага мора, таму зноў пачне прыпякаць. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 14 да 20 цяпла, а ўдзень прагназуецца плюс 25—32 градусы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Бацькі і дзеці

# 10 КІЛАМЕТРАЎ РАЗАМ!

**Міжнародны дзень бацькі адзначаецца ў трэцюю нядзелю чэрвеня ў 52 краінах свету. Беларускім татам таксама нагадалі пра іх статус падчас розных мерапрыемстваў, што прайшлі ў Мінску. Самыя вынослівыя і заўзятыя апынуліся на старце 10-кіламетровага прабегу «Бацькі і дзеці». Яго арганізатары — першая інклюзіўная спартыўная каманда ў Беларусі «Крылы анёлаў» (удзельнікі якой — дзеці з абмежаванымі магчымасцямі (анёлы) і здаровыя дарослыя — крылы каманды) і «Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам».**



Пачатак 10-кіламетровай дыстанцыі.

— Гэта будзе цяжэй, чым адціснуцца 100 разоў за хвіліну, бо бегчы прыйдзецца павольна, — папярэдзіў перад стартам спартсменаў Дзмітрый ЦІМАШКОЎ, заснавальнік і дырэктар «Крылаў анёлаў». Сам ён таксама адолеў самую доўгую дыстанцыю разам з дачкой Ліляй, якая, як і іншыя дзеці, што не могуць бегчы самастойна, усю адлегласць «прабегла» на спецыяльнай спартыўнай калясцы, якую рухаў бацька.

На самым першым 10-кіламетровым старце (пачатак веласцежкі недалёка ад першай кальцавой дарогі ў раёне аквапарка «Лебядзіны") збіраюцца самыя стойкія ўдзельнікі. Зміцер з сябрам, напрыклад, пачнуць тут, а на 2-кіламетровай дыстанцыі да іх далучацца сын Зміцера Максім і дзеці сяброў: Філя, Сяргей і Ягор. Усе хлопцы займаюцца спортам, так што адолець два кіламетры для іх не праблема. Мілена і Лексія — сёстры, якія таксама нацэліліся на 10 кіламетраў. Падрыхтоўчая база ў дзяўчат маецца — яны ўдзельніцы спартыўнага руху Follow Minsk.

Яшчэ два дадатковыя старты для далучэння да прабегу арганізатары запланавалі каля гатэля «Марыёт» (5 км да фінішу) і каля цэнтральнага ўваходу ў парк Перамогі (700 метраў да фінішу), так што выбраць адрэзак па сілах мог кожны.

Збіраліся бегуны і цэлымі сем'ямі, падбіраючы дыстанцыю пад узрост. Каманда «Васількі», напрыклад, бегла толькі апошнія 700 метраў. Сям'я Васільевых — гэта тата Андрэй, мама Таня, дзеці Андрэй, Насця і Арына. Апошняй, дарэчы, 4,5 месяца, так што фінішавала яна на руках у таты.

Фінішную стужку нечакана, задоўга да з'яўлення асноўнай масы ўдзельнікаў, парваў хлопчык Цімафей, які далучыўся да бегуноў на дыстанцыі ў 2 км. «Пакуль іншыя беглі ў звычайным тэмпе, я паскорыўся, вырваўся наперад і хутка быў перад дарослымі», — кажа ён, вышукваючы вачыма тату Яўгена, які адолеў 10 кіламетраў.

Кожны, хто дасягнуў фінішу, атрымаў сімвалічны медаль за ўдзел у прабегу. Камандам-сем'ям дасталіся яшчэ і ўзнагароды ў намінацыях «Сямейная эстафета» і «Мой тата самы моцны». Самымі «медалёвымі» сталі сем'і Студневых, Вірскіх і Трыкозаў.

— Усе ў жыцці бяруць аднолькавы старт, толькі фініш ва ўсіх розны. А ў сённяшнім мерапрыемстве мы зрабілі наадварот: удзельнікі стартавалі з розных участкаў, а дабеглі ўсе разам, — рэзюмаваў Дзмітрый Цімашкоў пасля ўзнагароджання і перад вынасам тортаў.

***Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.***

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

## ХАРВАЦКІЯ УЛЬТРАС СУПРАЦЬ СВАІХ

Выступленні фанатаў маюць магчымасць стаць непрыемнай і небяспечнай адметнасцю гэтага чэмпіянату. У матчы Харватыя — Чэхія паказалі сябе ўльтрас харвацкай дружыны, прычым гэта адбылося, калі іх каманда выйгравала. На поле паляцелі фаеры, адзін з іх нават трапіў у сцюарда, які ўпаў на зямлю. На шчасце, ён не пацярпеў. Харвацкія футбалісты ледзь супакоілі балельшчыкаў, суддзя гульню спыніў, але затым дазволіў яе закончыць, прычым у выніку зборная Харватыі ўпусціла перамогу ў гэтым матчы — у дадатковы час чэхі лік зраўнялі. УЕФА адкрые з гэтай нагоды дысцыплінарную справу, каманду чакаюць сур'ёзныя санкцыі, размова можа ісці і пра адхіленне каманды ад далейшага ўдзелу ў турніры. Галоўны трэнер «шашачных» Антэ Анчыч адзначыў, што гэта не балельшчыкі зборнай, а тэрарысты. Як стала вядома пазней, харвацкія ўльтрас збіраюцца сарваць гульню сваёй каманды супраць зборнай Іспаніі, якая адбудзецца сёння ў Бардо. Яны выклалі ў інтэрнэце план сваіх дзеянняў і спадзяюцца на выключэнне зборнай з чэмпіянату. Такім чынам ультрас пратэстуюць супраць футбольнага саюза сваёй краіны, які яны абвінавачваюць у карумпаванасці.

## ПЕРШЫ АЛБАНСКІ

Каманда Албаніі следам за Уэльсам і Ісландыяй атрымала першую перамогу на буйных турнірах у сваёй гісторыі — з лікам 1:0 над зборнай Румыніі. Апошняя занялі чацвёртае месца ў групе А і пакінулі чэмпіянат. Албанцы ж маюць, хоць і невялікі, шанц выйсці ў 1/8 фіналу.

## НА ШВЕЙЦАРСКІ СЦЯГ



У матчы заключнага тура групавога этапу чэмпіянату Еўропы-2016 паміж зборнымі Швейцарыі і Францыі футбалісты «трохколерных» парвалі сапернікам чатыры футболкі. Пасля гэтага ў сацыяльных сетках многія падвергнулі крытыцы кампанію Puma, чыёй прадукцыяй карыстаюцца футбалісты зборнай Швейцарыі. Але не толькі форма не вытрымала напружання гэтай безгалявой нічыёй — у другім тайме лопнуў і асноўны футбольны снарад. Мяч замянілі, але асадак, як той казаў, застаўся.

## ЧАМАДАН, ВАКЗАЛ, МАНЧЭСТЭР

Нелюбоў балельшчыкаў да асобных футбалістаў прымае розныя формы, часам не агрэсіўныя, а даволі забаўныя. Вось, напрыклад, англічанін Аарон Бэмфард завёў старонку ў інтэрнэце па зборы дапамогі на білет з Францыі ў Англію для паўабаронца сваёй зборнай і «Манчэстэр Сіці» Рахіма Стэрлінга. Ужо за некалькі гадзін пасля стварэння старонкі заўзятар змог сабраць больш за 300 фунтаў. Такім чынам балельшчыкі зборнай Англіі падтрымалі крытыку, якой падвяргаецца Стэрлінг за няўдалую гульню ў складзе нацыянальнай каманды на Еўра-2016. А «ногі растуць» у гэтай нелюбові яшчэ з часоў пераходу футбаліста за вялікія грошы з «Ліверпуля» ў «Сіці», дзе, між іншым, якасць гульні Рахіма даволі моцна знізілася. Многія лічаць, што новы буйны кантракт сапсаваў хлопца, і цяпер «курс Стэрлінга» вельмі крута падае.

## САМЫЯ ДАРАГІЯ

Нападаючы зборнай Партугаліі Крышціяну Раналду прызнаны самым дарагім футбалістам Еўра-2016, паведамляе Bloomberg. Кошт форварда «Рэала» ацэньваецца ў $116 мільёнаў, і гэта прыкладна ў тры разы больш, чым кошт усіх футбалістаў зборнай Венгрыі, разам узятых.

А вось дзясятак самых дарагіх футбалістаў Еўра-2016. 1. Крышціяну Раналду (Партугалія) — $116 млн. 2. Томас Мюлер (Германія) — $79 млн. 3. Эдэн Азар (Бельгія) — $74 млн. 4. Роберт Левандоўскі (Польшча) — $74 млн. 5. Поль Погба (Францыя) — $68 млн. 6. Серхіа Бускетс (Іспанія) — $53 млн. 7. Рахім Стэрлінг (Англія) — $53 млн. 8. Лука Модрыч (Харватыя) — $53 млн. 9. Арда Туран (Турцыя) — $37 млн. 10. Леанарда Банучы (Італія) — $31 млн.

Самай дарогай зборнай Еўра прызнана каманда Іспаніі — $736 млн. У тройку таксама ўвайшлі Германія ($633 млн) і Францыя ($551 млн).

**Іван КУПАРВАС.**

## Ад Фінляндыі да Фарэр

### Адбылося лёсаванне першых раўндаў футбольных Еўракубкаў

У выніку БАТЭ ў другім раўндзе Лігі чэмпіёнаў згуляе з фінскай камандай СІК. Салігорскі «Шахцёр» за пуцёўку ў другі этап кваліфікацыі Лігі Еўропы пазмагаецца з «Рунавікам» з Фарэрскіх астравоў, мінскае «Дынама» — з латвійскім «Спартаком» (Юрмала). Жодзінскі «Тарпеда-БелАЗ» у гэты турнір уключыцца ў барацьбу з другога раўнда. Сапернікам «аўтазаводцаў» стане пераможца пары «Дэбрэцэн» (Венгрыя) — Ла Фьёрыта (Сан-Марына). Першыя матчы кваліфікацыі другога раўнда Лігі чэмпіёнаў адбудуцца 12—13 ліпеня, пачатковай стадыі Лігі Еўропы — 30 чэрвеня.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*